# Першая выстава габелена ў Мазыры

***У Мастацкай галерэі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна 6 мая адкрылася выстава габелена «Творчая майстэрня», дзе прадстаўлены работы выкладчыкаў і навучэнцаў Мазырскай дзіцячай школы мастацтваў.***


Вольга Літвіна


Жанна Панцэвіч

У наш механізаваны час, калі амаль усё робяць машыны, адыходзяць у забыццё даўнія традыцыі працы ручной. Асабліва шкада, калі забываюцца віды мастацтва, што ў старажытнасці карысталіся вялікім попытам і з'яўляліся ўзорам зграбнасці і вытанчанасці. Да такога віду мастацтва адносіцца і выраб габелена. Але і сёння знаходзяцца харызматычныя людзі, якія імкнуцца засвоіць і тым самым захаваць каштоўныя веды і навыкі мінулых стагоддзяў.

Мазыру пашанцавала. Ён адзін з тых рэдкіх мясцін у Беларусі, дзе пад кіраўніцтвам спецыялістаў можна прыняць удзел у стварэнні арыгінальных, выключна дэкаратыўных габеленаў. Гэтую магчымасць прапануе Дзіцячая школа мастацтваў. Дырэктар школы Святлана Сяркова на адкрыцці выставы адзначыла, што габелен – гэта вельмі складаная, працаёмкая і дарагая тэхніка. Сённяшнія работы выстаўляюцца ўпершыню, таму Святлана Іванаўна павіншавала выкладчыц Вольгу Літвіну і Жанну Панцэвіч з дэбютам і пажадала ўсім прысутным прыемнага прагляду.

А паглядзець сапраўды ёсць на што! Па-майстэрску выкананыя і не падобныя адзін да аднаго габелены ствараюць атмасферу ўтульнасці і камфорту. Ад іх вее пяшчотай і мяккасцю, і ў гледача абуджаецца жаданне пагладзіць іх рукой.

Паводле слоў Жанны Міхайлаўны, раней габелены (яны былі вялікіх памераў) якраз для таго і выкарыстоўваліся, каб уцяпляць і адначасова ўпрыгожваць каменныя замкі, палацы, саборы. Набыццё габеленаў маглі дазволіць сабе толькі вельмі заможныя людзі. У Беларусі зараз ёсць толькі адно прадпрыемства, дзе вырабляюцца габелены, – гэта Барысаўская фабрыка мастацкіх вырабаў. А так, толькі рэдкімі адзінкамі існуюць мастацкія школы, дзе навучаюць гэтаму старажытнаму віду ткацтва.

Прадстаўленая на выставе адзіная работа Жанны Міхайлаўны мае назву «Пачатак». У гэтым арыгінальным габелене ўражвае выкарыстанне розных тэхнік пляцення. А спакойныя адценні колераў ствараюць медытатыўную гармонію.

На выставе дэбютавала і вучаніца Жанны Міхайлаўны – Дзіяна Драздова. Яе габелен атрымаў назву «Раніца». Дарэчы, вобразы сваіх габеленаў вучні прыдумваюць самі. Самі малююць, самі пляцуць. Вось і Дзіяна не шукала нешта гатовае ў інтэрнэце. А тое, што ўбачыла ў фантазіі сваёй душы, тое і намалявала, а потым ніткай за ніткай уплятала ў свой першы, поўны дзявочай далікатнасці, шэдэўр.


Дзіяна Драздова і габелен «Раніца»

На выставе таксама прадстаўлены і работы іншых навучэнцаў.

Дэбютавала таксама на выставе і В. Літвіна. Гэта яна падала ідэю сумеснай выставы навучэнцаў і выкладчыкаў – каб дзеці глядзелі, што робяць іх педагогі і натхняліся самі зрабіць што-небудзь прыгожае. Вольга Анатольеўна кажа, што кірунак габелена не зусім развіты, але ёй цікава гэтым займацца, гэта заспакойвае. На пытанне: «Ці не цяжка?» адказвае – *«Любая праца патрабуе часу. Хутка нічога не вырабляецца. Чалавеку, які будзе гэтым займацца, трэба валодаць такімі якасцямі, як працавітасць, уседлівасць, цярплівасць. І ў многіх любое рамяство, тая ж самая вышыўка, усюды патрабуе часу. Акрамя таго, трэба патраціць час на падрыхтоўчы працэс: на падрыхтоўку эскіза, ад ідэі да лінейнага вырашэння, затым у колеры. Канечне, калі працуеш фарбамі, гэта нашмат хутчэй. І работа нараджаецца вельмі хутка. Сённяшняя моладзь патрабуе ўсё і адразу. А тут, канечне, доўга. Патрэбна ўседлівасць. Гэты занятак для тых людзей, якім не цяжка займацца манатоннай працай».* У экспазіцыі выставы прадстаўлены чатыры габелены Вольгі Анатольеўны: трыпціх «Лотасы», «Глякі», «Дрэва жыцця» і нацюрморт. Гэтыя работы вызначаюцца адначасова прастатой і грацыёзнасцю.

І можна сказаць, што кожны габелен – гэта асобная душа, асобны вобраз, асобная гісторыя, у якія можна ўглядацца гадзінамі.

***Таццяна ПРАКОПЧАНКА,***
***г. Мазыр***

**P.S.** Калі рыхтаваўся гэты матэрыял, трапіўся мне на вочы верш Уладзіміра Дубоўкі, які пачынаецца наступнымі радкамі:

*Родная мова, цудоўная мова!*
*Ты нашых думак уток і аснова!*

Як прыемна было адчуць, што я цяпер вельмі добра разумею сэнс слоў «уток» і «аснова»! Нават класік карыстаўся гэтымі тэрмінамі, і так важна, каб гэтыя паняцці не зніклі з нашага слоўнага скарбу!